тал новую технологию производства, позволявшую изготавливать наборы колоколов по определенным тональностям (ладам) и аккордам.

Рассмотрев некоторые особенности и характеристики изукраса белорусских колоколов, следует отметить, что литейное искусство развивалось в направлении удовлетворения духовных потребностей человека в прославлении Бога, служении ему, устремленности к высшим духовным и нравственным ценностям. Выработанные веками традиционные формы и виды изукраса колоколов имеют большое значение и для современной Беларуси. С 1995 г. возобновилось литье колоколов на ООО "Отменное литье" г. Минска, где поставлена задача сохранения старинных белорусских традиций художественного литья.

[1] Вецер Э.І., Хадыка Ю.В. Звон у Моладаве // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1971. - №1. - С. 31 – 33.
[2] Брокгауз Ф., Эфрон И. Энциклопедический словарь. - СПб., 1897. - Т.22. - С. 610.
[3] Мілінкевіч А. З гісторыі званоў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. - 1988. - №4. - С. 21.
[4] Беларуская мова: Энцыклапедыя. – Мн., 1994. - С. 481.
[5] Сапунов А., Друцкой-Любецкой В. Материалы по истории и географии Дисненскаго и Вилейскаго уездов Виленской губернии. - Витебск, 1896. - С. 107.
[6] Мілінкевіч А. З гісторыі званоў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1988. - №4. - С. 21.
[7] Тамсама, с. 22.
[8] Вецер Э.І., Хадыка Ю.В. Звон у Моладаве // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1971. - №1. - С. 31 – 33.
[9] Брокгауз Ф., Эфрон И. Энциклопедический словарь. - СПб., 1897. – Т.22. - С. 690.

**А.У. Рагуля, С. Карбаценка**

## КРЫЖ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ – ПОМНІК БЕЛАРУСКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ

Гаварыць аб часе, у які былі зроблены тыя ці інўыя рэчы, аб эстэтычных каштоўнасцях часу, аб сацыяльным укладзе, аб светаўспрыманні, аб людзях, якія стварылі гэтыя рэчы, і яшчэ шмат цікавага, патаемнага можа нам паведаміць простая шкарпэтка, нейкі збан, манета, ручнік, словам, усё тое, што было да нас, да нашай матэрыяльнай свядомасці. Зірніце, гэта простыя прылады працы, упрыгожанні, вопратка. А што можна казаць аб рэчы, якая мае духоўную каштоўнасць, матэрыяльную і інфармацыйную каштоўнасці? І вось такой рэччу з'яўляецца помнік мастацкай культуры, помнік духоўнай спадчыны беларусаў, помнік святой веры хрысціянскай, сведка жыцця прападобнай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай, якая дакраналася да яго сваімі тонкімі духоўнымі пальцамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

помнік нашага пісьменства, беларуская нацыянальная святыня -- крыж Еўфрасінні.

Стварэнне ў старажытным Полацку такога шэдэўра мастацкай і духоўнай спадчыны з святымі мошчамі евангелістаў, заснавальнікаў праваслаўя, кроўю Гасподняй, святых ахоўнікаў Еўфрасінні і яе бацькоў, сведчыць аб культурнай суверэннасці дзяржавы, яе значнасці і моцы.

На сённяшні дзень вядомыя тры копіі крыжа, якія былі зроблены з арыгіналу. Першая была зроблена ў 1495 г. у Смаленску; другая - паводле беларускага летапісу "Хронікі Быхаўца" - "ёсць згадка пра дачку полацкага князя Васіля Параскеву, што была абвешчаная ў Рыме святою пад імем Праксэды". Тут жа захаваліся звесткі пра крыж з надпісам, што ў ім ёсць частка святога дрэва, падараванага Праксэдзе рымскім папам Аляксандрам Чацвёртым. Гэты крыж, як сцвярджае спадар Арлоў, быў копіяй крыжа Еўфрасінні. Цяпер ён знаходзіцца ў Яраслаўска-Растоўскім музеі-запаведніку. І трэцяя копія, малавядомая, згадваецца ў кнізе беларускага фальклярыста, этнографа і педагога Сяргея Сахарава "Православные церкви в Лотгалии" (Рыга, 1939): у Абрэнскай царкве "знаходзіцца копія каштоўнага крыжа найпадобнейшай Еўфрасінні, князёўны Полацкай".

Нельга абмінуць увагай тое, што ў сённяшні час крыж рэканструяваны. Гэта зрабіў брэсцкі мастак-ювелір і эмальер Мікола Кузьміч. Ён член Беларускага саюза мастакоў, удзельнік восьмай і дзевятай Міжнароднай біенале мастацтва эмалі ў Ліможы (Францыя, 1986 і 1988) і Першай усесаюзнай выставы ювелірнага мастацтва (1990). "Прызнаннем таленту і высокага майстэрства Кузьміча сталася экспанаванне яго твораў у Расеі, Польшчы, Францыі, Нямеччыне, Злучаных Штатах Амерыкі...". І таму выбар паў менавіта на гэтага мастака, аднаго з лепшых майстроў на Беларусі па эмальернаму мастацтву.

Пры стварэнні падобнай копіі, як гэта, паўстае пытанне, якое М. Кузьміч задаў на адной з канферэнцый: "Будзе гэты твор халодным паўтарэннем помніка далёкай мастацкай эпохі або існуе магчымасць стварыць крыж, які мог бы стаць сакральнай каштоўнасцю для нашых сучаснікаў?.." Адказа на гэтае пытанне ён, на жаль, не даў.

Каб стаць глыбока сакральнай рэччу, рэліквіі трэба прайсці шмат выпрабаванняў. Трэба даказаць, што гэты аналаг можа замяніць сапраўдны крыж Еўфрасінні, як сімвал-апатрапей дзяржавы і ўсяго беларускага народа.

Такім чынам, на сённяшні дзень беларусы маюць два "жыватворныя" сімвалы. Але пытанне, які з іх больш ахоўвае Беларусь і які трэба лічыць сапраўдным апатрапеем, яшчэ патрабуе адказу. Лазар Богша, стварыўшы больш за васемсот гадоў таму рэлігійны шэдэўр, не ведаў, чым абернецца гэты прадмет для народа.

Ён меў сваю школу і паслядоўнікаў, але яго імя не лічыцца ні ў адным энцыклапедычным даведніку па мастацтве, толькі ў кантэксце жыцця Еўфрасінні ці эмальернага мастацтва. Нашым добрасумленным навукоўцам яшчэ прадбачыцца папрацаваць над гэтай праблемай і змяніць старонкі ў энцыклапедыях ці скласці новую. Наконт "спадкаемца" Лазара Богшы - Мікалая Кузьміча, можна з дакладнасцю адзначыць, што праз некалькі гадоў ці ўжо цяпер яго імя будзе ведаць сваё месца. Толькі вось як "спадкаемца" ці самастойнага мастака?

На думку рэлігійных асоб, галоўнай і самай значнай каштоўнасцю крыжа з'яўляюцца ўкладзеныя ў сярэдзіне ў пяці квадратных падпісаных гнёздах бясцэнныя святыні: часціца дрэва крыжа Гасподня з кропляй крыві Выратавальніка, часціцамі камянёў Гроба Гасподня і Гроба Божай Маці, часціцамі мошчаў першамучаніка архідыякана Стэфана, вялікамучаніка і цаліцеля Панцеляімана, крыві пакутніка Дзмітрыя Салунскага. Але акрамя духоўных святынь ёсць мастацкае аздабленне, выкананае з высокім густам аўтараў - прападобнай Еўфрасінні Полацкай і майстра-ювеліра Лазара Богшы.

Акрамя матэрыяльнай каштоўнасці і арнаментальна-сімвалічнай значнасці ёсць пісьменная фіксацыя імён святых і тэксту з гістарычнымі фактамі. Амаль на кожнай пласцінцы крыжа выцеснены літары, якія складаюцца ў словы. Некаторыя з надпісаў чытаць даволі нязручна. Напрыклад, імёны святых размешчаны па вертыкалі. Чытаць "пантэон" святых з крыжа трэба знізу ўверх, таму што пласткі накладалі на драўляную аснову менавіта знізу.

З надпісаў мы даведваемся не толькі аб імёнах святых. На апошняй пластцы з адваротнага боку часткова грэчаскімі літарамі, часткова кірылічнымі (паўуставам) зроблены кароткі надпіс: "Господи, помози рабоу своему Лазорю, наречённому Богъшим, съделавъшемоу крьсъ сии црькви святого Спаса и Офросиньи". Адсюль становіцца зразумелым, хто быў майстрам гэтай славутай святыні.

На пазалочаных пластках з бакоў крыжа выбіты вялікі тэкст. "Въ лето 6669 покладаеть Офросинья чьстьный крестъ въ манастыри своемъ въ црькви святого Спаса. Чьстьное древо бесценьно есть, а кованье его, злото и серебро и каменье и жьнчюгъ въ 100 гривнъ, а да... (пропуск) 40 гривнъ. Да не изнесеться из манастыря никогда же, яко ни прдати ни отдати. Аще се кто преслоушаеть изнесеть и от манастыря, да не боуди емоу помощникъ чьстьный крестъ ни въ се векъ, ни въ боудоущий и да боудеть проклятъ святою животворящею троицею и святыми отци 300 и 50 (?) семию съборъ святыхъ отець, и боуди емоу часть съ Июдою, иже преда Христа. Кто же дрьзнеть се... (пропуск) властелинъ, или князь, или пискоупъ, или игоуменья, или инъ который любо человекъ, а боуди емоу клятва си. Офросинья же,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раба Христова, сътяжавъши крестъ сий, приметъ вечную жизнь съ всеми святыми...".

Звычайна сакральныя ювеліры таго часу не мелі падобных нататкаў.

Па зместу тэкст можна падзяліць на дзве часткі. У першай палове гаворка ідзе пра матэрыяльныя затраты і месце палажэння крыжа. У другой - змешчаны тыповы для таго часу заклён супраць рабавальнікаў і несумленных людзей. Іншымі словамі, гэта тыповая схема будавання падобных тэкстаў для сярэднявечча.

На наш погляд, мова, якая выкарыстана ў дадзеным тэксце, перапляла ў сабе старажытнаславянскую і "жывую" мовы старажытных беларусаў. На наяўнасць так званай "жывой" мовы ўказвае лексіка карыстання, напрыклад, у заклёну. Але, нягледзячы на дзве часткі тэксту, тут існуе адзінства стылю - жыццядзейнасць і мысленне. Падкрэсліваецца каштоўнасць зямлі, месца, узмацненне і ўшанаванне, уз'яднанне і адзінамысленне - да чаго і імкнулася Еўфрасіння з дзяцінства. Вялізарная любоў да сваёй зямлі, да зямлі сваіх продкаў усё жыццё суправаджалі яе.

Формула гармоніі - адзінства Бога, душы і чалавека. Поўная ўтульнасць існавання ў сусвеце засталася ад язычніцкіх часоў. Няма супрацьпастаўлення божага свету і зямнога быцця. Разам з тым за парадкам чалавечага існавання сачылі суровыя, адказныя і назіральныя лікі святых. Асноўнае намаганне ўсёй справы Еўфрасінні - з'яднаць і недапусціць разбэшчанасці, што і было часткова выказана ў тэксце.

Змяшчэнне натацыі пра сябе ў тэксце шэдэўра гаворыць, магчыма, аб пачуцці чалавечай годнасці.

Факт выкарыстоўвання пісьменнасці ў ювелірным мастацтве сведчыць аб пашыранай адукаванасці дзяржавы на той час. Аналагічных помнікаў сакральнай мастацкай культуры ні ў Расіі, ні ў знакамітых скарбах Кіева не сустракаюцца. Рыбакоў, Аляксееў, Макарава у сваіх працах крыж адносяць да старажытнарускага мастацтва, з чым ні ў якім разе нельга пагадзіцца. Гістарычна даказаная дзяржаўнасць Полаччыны, як першаўтварэнне старажытнабеларускай тэрыторыі, не дае падставы так лічыць.

Інтанацыйны памер і граматычны склад надае падставы меркаваць і быць упэўненымі, што аўтарам гэтага тэксту з'яўляецца сама прападобная Еўфрасіння Полацкая. Імкненне сабраць усё лепшае ў адным месцы азначала кансалідацыю беларускага этнасу на духоўнай аснове. Нібы замаўляе ахоўніца беларусаў на лепшы лёс. Нельга адмаўляць сакральнае значэнне тэксту. Ён з'яўляецца фактычным засваеннем хрысціянства, духоўных каштоўнасцей праваслаў'я.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Галоўнай мэтай у гэтым пункце было падкрэсленне наяўнасці пісьменнасці як пашыранай з'явы ў сярэдзіне XII ст. Тэкст з крыжа Лазара Богшы можа займаць годнае месца ў літаратуры і мастацтве шрыфту старажытных беларусаў.

## МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА І ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ

**Н.Г. Ильина**

### “КРАСОТА” В ДУХОВНО-НРАВСТВЕННОМ ВОСПИТАНИИ ЛИЧНОСТИ

Искусство и литература обладают способностью проникать в различные сферы человеческого духа, нести людям знание о мире, служить мощным средством преобразования жизни. Роль литературы и искусства в идейно-нравственном воспитании, в духовном сближении людей определяется, прежде всего, познавательными и эстетическими функциями, способностью воздействовать на волю и разум человека. Литература и искусство подвигают человека создавать духовные ценности, а ценности в культуре и, следовательно, в литературе - - это уже художественно реализованные человеческие цели, добытые знания и представления, осмысленные, проверенные опытом людей установки, рекомендации, результат духовного освоения человеком мира, превращение им должного в сущее, идеального в реальное. В каждой национальной культуре и литературе свои ценности. Однако по причине присущих им объективных моментов содержания, обусловленных не только местом и временем, но и общечеловеческими родовыми признаками, они способны взаимодействовать друг с другом, взаимоотражаться и взаимовлиять друг на друга.

Наша задача - на примерах литературы и народного искусства посмотреть, как в процессе художественного творчества и в процессе восприятия и переживания искусства категория “прекрасного” ведет к пробуждению духовных сил человека, к активизации заложенных в нем интеллектуальных, моральных и художественных возможностей.

Вся мировая литература предупреждает нас о том, что мир, в котором живет человечество, может рухнуть в одночасье. И не от атомной или водородной бомбы, а от бездуховности, черствости, эгоизма. Из туманного Альбиона доносятся слова Шекспира:

Тот, у кого нет музыки в душе,
Кого не тронут сладкие созвучья,
Способен на грабеж, измену, хитрость.
Темны, как ночь, души его движенья,
И чувства все угрюмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ